УДК 947.6(=411.6) (1914/1916)

# НЕВЕЛЬСКАЯ ДЫВЕРСІЙНАЯ АПЕРАЦЫЯ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Міхаіл Цуба***
*Пінск, Беларусь*
*cubanm05@rambler.ru*

У дадзеным артыкуле распавядаецца пра адну з самых дзёрзкіх партызанскіх аперацый у тылу ворага падчас Першай сусветнай вайны. Комплексна і ўсебакова даследуюцца розныя аспекты аперацыі, якія прывялі да яе паспяховага ажыццяўлення.

***Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, партызаны, аперацыя, вайсковае фарміраванне, гарнізон, камандзір атрада, апорнае ўмацаванне, начная атака, штаб, пазіцыі, дывізія, полк.***

# NEVEL SABOTAGE OPERATION DURING WORLD WAR I

***Mikhail Tsuba***
*Pinsk, Belarus*

This article contains the information about one of the most daring partisan operations behind enemy lines during World War I. Different aspects of the operation, which led to its successful implementation, are explored in a comprehensive and integrated manner.
***Key words: World War I, partisan, military operation, military formation, garrison, squad leader, supporting reinforcement, night attack, headquarters, position, division, regiment.***

Як вядома, 1 жніўня 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна, а праз год, у жніўні 1915 г. беларускія землі апынуліся ў эпіцэнтры ваенных дзеянняў паміж расійскімі і германскімі войскамі. Тут быў праведзены шэраг ваенных аперацый, якія змаглі паўплываць на ход і характар Першай сусветнай вайны. Напрыклад, Свянцянскі прарыў, які з’уляўся самым вялікім па маштабах прарывам у ходзе ўсёй вайны; Палеская аперацыя, што спыніла далейшы рух наперад германскіх войск; Нарачанская аперацыя, якая ў значнай ступені прадвырашыла лёс бітвы пад французскім Вердэнам; Баранавіцкая ваенная аперацыя, якая дапамагла паспяхова ажыццявіць знакаміты “Брусілаўскі прарыў” на тэрыторыі Украіны; Крэўская аперацыя, якая ў істотнай долі пасадзейнічала развіццю наступлення англійскіх войск пад Іпрам.

Разам з агульна вядомымі на беларускіх землях бітвамі падчас Першай сусветнай вайны мелі месца ў разглядаемы перыяд і іншыя ваенныя аперацыі – партызанскія. Патрэбна адзначыць, што партызанскія напады час ад часу таксама ставілі даволі сур’ёзныя праблемы перад германскімі акупацыйнымі ўладамі. Адным з найбольш вядомых такіх нападаў з’яўляецца Невельская партызанская аперацыя. З прыбліжэннем 110-годдзя правядзення гэтай аперацыі цікавасць да яе павялічваецца. Абумоўлена гэта ўзрастаючым інтарэсам беларусаў да пазнання гісторыі свайго краю, да даследавання тых асоб беларускага паходжання, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў невельскім набегу, а таксама да спрыяльнай дзейнасці тутэйшых людзей нашай мясцовасці, якія адыгралі вялікую ролю ў паспяховым ажыццяўленні вышэй адзначанай аперацыі.

Акрамя таго на дадзеным участку мяжы Беларусі з Украінай і па-сёння хапае балот, лясоў і іншых глухіх мясцін. Абарона альбо наступленне на балоціста-лясістай мясцовасці патрабуе сваёй спецыфікі, мае свае істотныя адметнасці, асабліва калі гэта датычна партызанскага руху. У сувязі з чым вопыт Першай сусветнай вайны вельмі актуальны і патрабуе неабходнага вывучэння. Аналіз літаратуры па пытаннях партызанскага руху падчас Першай сусветнай вайны і Невельскай партызанскай аперацыі сведчыць аб тым, што гісторыкамі, краязнаўцамі і публіцыстамі зроблены пэўны крок у вывучэнні названай праблемы. У дачыненні гэтай тэматыкі нейкую цікавасць прадстаўляюць артыкулы Аляксея Каўко [1, с. 99-100], Андрэя Іванова [2], Аляксея Алейнікава [3] і інш. У сваёй большасці гэтыя работы носяць публіцыстычна-мемуарысцкі характар і з’яўляюцца для сучасных гісторыкаў хутчэй даведнікам па тэме, чым самастойным навуковым даследаваннем. Да ліку найбольш грунтоўных прац аб партызанскім руху дадзенага перыяду і невельскаму нападу трэба аднесці работы Уладзіміра Заварошкіна [4] і Алега Грабеннікава [5]. Дадзеныя артыкулы прываблiваюць да сябе змястоўнай, у многім унікальнай гісторыка-інфармацыйнай фактурай. Аднак яны разглядаюць падзеі ў Невелі з пункту гледжання расійскай дзяржаўнасці, так як грунтуюцца на аснове расійскіх крыніц, дзе значна завышаны маштабы аперацыі і страты праціўніка. У выніку мы бачым погляд на падзеі з аднаго боку, з аднаго берага.

Выкарыстанне нямецкіх крыніц дае магчымасць заглянуць ужо з іншага боку на вышэй адзначаную аперацыю. Няма сумненняў, што тут ужо ў сваю чаргу заніжаны маштабы, лічбы, факты. Менавіта параўнанне ў статыстыцы аднаго і другога бакоў набліжае нас да больш-менш аб’ектыўных вынікаў. Сур’ёзным недахопам амаль усіх прац па невельскаму набегу з’яўляецца недаацэнка, а ў большасці ўвогуле адсутнасць, ігнараванне ролі ў гэтым набегу Сідара Паўлюкаўца і жыхароў навакольных з Невелем вёсак, хутароў. Таму што без іх удзелу і дапамогі, шансаў паспяхова ажыццявіць Невельскую партызанскую аперацыю ў расійскіх войск амаль не было. Улічваючы наспелую актуальнасць з аднаго боку, а з другога – недастатковую распрацаванасць падзей, што мелі месца ў Невелі, у гэтай рабоце мы паспрабуем сабраць самыя розныя звесткі аб Невельскай аперацыі і правесці комплекснае, рознабаковае і аб’ектыўнае даследаванне.

Да канца лета 1915г. значная частка беларускіх земляў аказалася акупіраванай кайзераўскімі войскамі. 15 верасня 1915г. германскія войскі ўступілі ў Пінск. Бясконцыя рэквізіцыі і прыцягненне да строгай адказнасці за самае нязначнае парушэнне загадаў у дачыненні да мясцовага насельніцтва з боку расійскіх ваенных улад, змяніліся на яшчэ больш бязлітасны рэжым германскай акупацыйнай адміністрацыі. Забаранялася пісаць пісьмы на роднай мове, ездзіць у вагонах, якія не прызначаліся для мясцовага насельніцтва, варыць піва, прадаваць мяса альбо мясапрадукты, карміць аўсом коняў, лавіць рыбу, гандляваць прадуктамі новага ўраджаю, без дазволу забіваць жыўнасць, захоўваць агнястрэльную зброю і г.д. За парушэнне загадаў і распараджэнняў нямецкіх

акупацыйных улад мясцовыя жыхары падвяргаліся штрафам, турэмнаму зняволенню, а нярэдка і пакаранню смерцю [6, с.167,168]. Усё вышэй адзначанае не магло не выклікаць справядлівага гневу карэнных людзей у самых розных формах супраціўлення. Падпальваліся будынкі акупацыйнай адміністрацыі, забіваліся чыноўнікі ваеннага ведамства, адбываліся падпалы складоў з прадуктамі, фуражом і сенам, праводзіліся дыверсіі на чыгунцы, сабаціраваліся пастаўкі той ці іншай прадукцыі нямецкім уладам.

Гэта была тая прыдатная глеба на якую звярнула ўвагу Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. Расійскае камандаванне ўсё больш схілялася да думкі разгарнуць шырокамаштабную партызанскую вайну на акупіраваных немцамі тэрыторыях, таму што ведала, якую карысць прыносілі партызанскія дзеянні ў час вайны 1812 года. Арганізацыя партызанскай барацьбы і стварэнне партызанскіх атрадаў на беларускіх землях распачаліся з восені 1915 г. Менавіта ў гэты час у Стаўцы вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве было падрыхтавана «Настаўленне для арганізацыі партызанскіх атрадаў», згодна з якім з верасня 1915 года быў пакладзены пачатак фарміраванню партызанскіх атрадаў на ўсіх расійскіх франтах. У выніку за кастрычнік-лістапад 1915 г. было створана 28 партызанскіх атрадаў: на Паўднёва-Заходнім фронце 11, на Заходнім таксама 11 і на Паўночным – 6. Агульнае кіраўніцтва партызанскім рухам было ўскладзена на вялікага князя Барыса Уладзіміравіча, штаб-кватэра якога знаходзілася ў Магілёве пры Стаўцы галоўнакамандуючага [7, с.9,10].

Найбольш актыўны характар партызанскі рух павінен быў набыць у лясіста-балоцістым рэгіёне Беларускага Палесся. Менавіта тут, у сувязі з складанымі ўмовамі мясцовасці, праціўнік не мог стварыць суцэльнай лініі абароны, што дапамагала партызанам пераходзіць лінію фронта. Акрамя таго, балоты служылі надзейным сховішчам. Ужо напрыканцы 1915 г. у наваколлі Пінска пачалі дзейнічаць першыя партызанскія групы. Пэўную дапамогу ім аказвалі жыхары некаторых уцалелых вёсак. Як правіла, яны былі праваднікамі, давалі прытулак, забяспечвалі партызан харчаваннем. Кіраўніцтва партызанскай барацьбой тут узначаліў А.М. Ільін [6, с. 168]. Аднак ні на Піншчыне, ні ў іншых мясцовасцях значнай маштабнасці партызанскі рух не набыў. І гэта зразумела, бо не было пастаяннай, трывалай падтрымкі сярод мясцовых жыхароў. Да таго ж на акупіраваных землях мала засталося і самога насельніцтва. Як правіла, пры набліжэнні фронта ўсё дарослае насельніцтва прыцягвалася да выканання абарончых работ. Пасля чаго ваенныя ўлады як мясцовых жыхароў, так і шматлікіх бежанцаў імкнуліся любымі сродкамі выправіць з прыфрантавой паласы ў глыбокі тыл. Па загаду вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміяй вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, прыхільніка тэорыі «спаленай зямлі», пакінутыя непрыяцелю беларускія вёскі падлягалі бязлітаснаму знішчэнню. Аб гэтым расказваюць і афіцыйныя звесткі германскага генеральнага штаба, паведамляючы аб ваенных дзеяннях у пінскім напрамку: «Уся мясцовасць, па якой адступаў праціўнік, была нямым сведкам супраць падпальшчыкаў уласнага народа. Усюды, куды ні прыходзілі нашы войскі, яны знаходзілі пакінутыя і людзьмі, і жывёламі груды камянёў, на якіх то тут, то там тырчалі трубы. Даволі рэдка пападаліся цэрквы, над якімі зліталіся нават казакі. Вось і ўсё, што ўцалела на шляху адступаючых расійскіх армій» [8, с. 44-45]. Такім чынам, пры адступленні амаль нічога не пакідалася ў цэласці і захаванасці на беларускай зямлі. Аднак такі падыход не мог не пакласці свой адмоўны адбітак на адносіны застаўшыхся пад акупацыяй жыхароў не толькі да ворага, але і да тых партызан, якія дзейнічалі пад эгідай расійскай арміі. Акрамя тутэйшых партызан, якім усё ж у істотнай ступені ўдавалася знайсці ўзаемаразуменне з мясцовым насельніцтвам, на Палессі яшчэ знаходзіліся партызанскія атрады, накіраваныя сюды з Украіны камандаваннем Паўднёва-Заходняга фронту. Аб іх дзейнасці вядомы генерал А.А. Брусілаў расказвае наступнае: «Іваноў (галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам), узяўшы прыклад з вайны 1812 года, загадаў сфарміраваць ад кожнай дывізіі ўсіх армій фронту па партызанскаму атраду, затым даў загад ім рушыць на паўночны захад Палесся, дазволіўшы поўны прастор для дзеянняў. ...Выходзілі бясконцыя непаразуменні з мясцовымі жыхарамі, прычым, прызнаваючы толькі асабіста Іванова, гэтыя партызаны прычынялі безліч грабяжоў і мелі вельмі малую схільнасць ваяваць з ворагам. У апошнім я іх цалкам апраўдваў, бо на Пінскіх балотах рабіць конныя набегі было немагчыма, і яны нават калі б і хацелі весці конныя баі, усё роўна ні ў якім выпадку не змаглі б гэтага выканаць. Адзіная магчымасць ажыццяўляць набегі, і то з вялікімі цяжкасцямі, - гэта рабіць іх пяшком, узяўшы праважатага з мясцовых жыхароў. Пры такіх абставінах у балотах, месцамі бяздонных, можна было прабірацца па сцяжынках у тыл праціўніка, але знаходзіцца там доўга была нельга, так як партызаны там знішчаліся немцамі") [9, с. 173]. Што датычыцца грабяжу і рабаўніцтваў, то сапраўды сустракаліся на Піншчыне такія выпадкі, аб якіх пазначана ў адным з дакладаў мінскаму губернатару ад пінскага іспраўніка, дзе паведамляецца, што на прыфрантавой паласе «з крымінальных злачынстваў болей вядомых з'яўляецца выпадак забойства з мэтай грабяжа напрыкацы 1915 года невядомымі двумя казакамі–партызанамі мяшчан аколіцы Сернічкі – Пятра, Андрэя, Івана Палюховічаў і ранення ў галаву Карла Палюховіча.» [10]. Па ўспамінах таго ж А.А. Брусілава, далёка не ўсе партызаны-марадзёры атрымлівалі па заслугах: «Суседняя са мной 3-я армія (месцазнаходжанне - раён Пінска), што ўваходзіла ў склад Заходняга фронту, некалькі разоў скардзілася мне на агідныя ўчынкі, якія партызаны тварылі ў тылу, аб чым я неадкладна паведамляў галоўнакамандуючаму (маецца на ўвазе галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам М.І.Іваноў). Аднак і Іваноў з імі нічога не мог зрабіць, таму што, напаганіўшы ў адным якім-небудзь месцы, яны пераходзілі ў іншае і, зразумела, адраса свайго не астаўлялі» [9, с.173,174].

Аднак нас больш усяго цікавяць 8-я, 9-я і 11-я арміі Паўднёва-Заходняга фронту на базе якіх было створана 11-ць партызанскіх атрадаў. Сярэдняя колькасць байцоў у атрадах была розная, вагалася ад 150 да 170 чалавек. Менавіта пэўнай часткі з іх прадстаяў непасрэдны ўдзел у Невельскай партызанскай аперацыі. Усяго ў атрадах налічваліся 61 афіцэр, 1619 байцоў салдацкага складу пры якіх меліся 1790 коняў і ўся неабходная зброя,

і амуніцыя [4]. Дадзеныя партызаны моцна адрозніваліся ад сапраўдных партызан – выхадцаў з народных мас, так як былі прадстаўнікамі рэгулярных расійскіх войскаў. Галоўнакамандаваннем расійскай арміі задумвалася іх закідваць у выглядзе дыверсійных груп у тыл праціўніка для ажыццяўлення самага рознага кшталту дыверсій на чыгуначных вузлах, вузкакалейках, дарогах, якія ва ўмовах балоціста – лясістай мясцовасці набывалі асабліва важнае значэнне.

Вядома, што 20 верасня 1915г. гэтыя "партызаны", якія з'яўляліся цудоўнымі наезднікамі, дасканала валодалі шашкай і пікай былі накіраваны ў г. Роўна, на так называемыя, вучэбныя зборы па падрыўной справе. Прыкамандзіраванныя к дадзеным партызанскім атрадам высокакваліфікаваныя афіцэры – сапёры праводзілі з імі крапатлівую працу, падчас якой вучылі, як падрываць масты, склады, чыгуначныя рэйкі і цягнікі, выводзіць са строю вадакачкі і артылерыйскія гарматы, як правільна абыходзіцца і выкарыстоўваць ручныя гранаты для падрыву жывой сілы, а таксама розных камунікацый ворага [5]. Акрамя таго адбылося перафарміраванне ўжо створаных партызанскіх атрадаў, куды была ўключана на дабраахвотнай аснове нямала беларусаў. Сярод якіх магіляўчанін капітан Сцяпан Лявонцьеў. Лявонцьеў быў прызначаны камандзірам атрада, які ўваходзіў у Арэнбургскую казачую дывізію. Памочнікам камандзіра гэтага атрада з'яўляўся ўраджэнец вёскі Махро (20 км ад Невеля) прапаршчык Сідар Паўлюкавец. Да гэтага Паўлюкавец служыў у пяхотным палку, што дыслацыраваўся ў Лунінцы. Менавіта гэтыя афіцэры затым адыграюць архіважную ролю ў Невельскай аперацыі.

Напрыканцы кастрычніка 1915г. на адрэзку сканцэнтравання 8-й расійскай арміі, якая займала абарону па рэках Прыпяць і Весялуха адбыўся агульны збор усіх 11-ці партызанскіх атрадаў Паўднёва – Заходняга фронту. Пасля выдатнай вылазкі, якая завяршылася разгромам германскага гарнізона ў Кухоцкай Волі партызаны з натхненнем і настроем рыхтаваліся да новых паспяховых аперацый у пінскім рэгіёне. 6 – 9 лістапада 1915г. была праведзена разведка 3-мя групамі, у кожнай па 6 салдат і афіцэр, па нямецкіх тылах уздоўж вёсак Хойна—Жыдча—Невель—Дубчыцы. Прыкладна ў адным кіламетры ад вёскі Каморы, якая знаходзілася на расійскім баку фронту была знойдзена "балотнае вакно". Да самай ракі Струмень (Струмень гэта мясцовая назва аднаго з двух рэчышчаў ракі Прыпяць) тут падыходзілі дрыгвяністыя, моцна зарослыя хмызняком балоты і галоўнае, поўнасцю адсутнічалі варожыя блак–гаўзы, не было ні акопаў, ні патрулёў.

Такім чынам, прайшоўшы праз ваду і забалочанасць на лініі фронту, разведгрупы паглыбіліся ў тыл праціўніка да 8 км. Ад мясцовых сялян партызаны–разведчыкі даведаліся, што ў вёсцы Невель знаходзіцца буйнае германскае вайсковае фарміраванне з палкавым штабам. Гэты факт патрэбна было праверыць. У ваколіцах вёсак Перахрэсце і Невель каштоўныя звесткі аб колькасным складзе немцаў збірала ў мясцовага насельніцтва разведгрупа на чале з штабс–ротмістрам Ткачэнкам. Група карнета Смірнова даведалася ад мясцовых жыхароў, што ў невельскай фальваркавай сядзібе знаходзіцца штаб германскіх войск. Яшчэ адна група сотніка Мензялінцава разведала месцазнаходжанне патрулёў, вартавых і застаў [5].

Важным фактарам разведдадзеных была тое, што ўвесь асабісты склад кайзераўцаў, за выключэннем штабных афіцэраў, знаходзіўся ў невялікіх зямлянках, а мясцовага насельніцтва амаль зусім у Невелі не было. Справа ў тым, што напачатку бежанства многія мясцовыя жыхары, каб не быць выгнанымі казакамі з свайго роднага краю ў невядомыя скітанні па свету, хаваліся ў лясах і балотах. А затым, калі вярнуліся дамоў убачылі толькі папялішчы ад сваіх хат. Казакі не закранулі толькі царкву, ды чамусьці фальваркавую сядзібу. Прыйшлося будаваць зямлянкі. Але прыйшоўшыя сюды германцы аблюбавалі гэтыя месцы, хутчэй усяго з-за ўцалелай сядзібы, і выгнаўшы людзей з іх зямлянак, размясцілі тут сваё вайсковае фарміраванне. Людзі ж вымушаны былі перасяліцца ў навакольныя ад Невеля хутары да сваіх сваякоў і знаёмых. Такім чынам вярнуўшыся ў распалажэнне сваіх атрадаў разведчыкі–партызаны не толькі ў поўнай ступені пацвердзілі наяўнасць важнага ваеннага аб'екта ў вёсцы Невель, але і прадаставілі сабраныя імі ўсе неабходныя каштоўныя звесткі аб распалажэнні нямецкіх войск у гэтым населеным пункце.

Падрабязна абдумаўшы вынікі разведкі і прааналізаваўшы звесткі, атрыманыя шляхам апытання мясцовых сялян, на агульным савеце камандзіраў атрадаў была прынята канчатковае рашэнне ажыццявіць набег на невельскі гарнізон ворага ў бліжайшыя дні. У склад парызанскага фарміравання пад агульным камандаваннем падпалкоўніка Андрэя Астраградскага былі ўключаны атрады Арэнбургскай, 1-й Данской і 1-й Церскай казачых дывізій, а таксама 7-й, 10-й, 11-й Зводна – Гвардзейскай і 12-й кавалерыйскай дывізій [4].

Быў распрацаваны і складзены падрабязны план Невельскай аперацыі. Па гэтаму плану вёска Невель і фальварк падзяляліся на асобныя аб'екты, якія павінны былі атакаваць пяць атрадаў. Яшчэ двум атрадам прадпісвалася прыняць неабходныя меры для аховы і забяспечвання адыходу атрадаў па заканчэнні правядзення аперацыі. І хаця пераможцаў не судзяць, нельга праігнараваць той факт, што не абышлося і без незразумелых праяў з боку кадравых афіцэраў расійскай арміі, хай сабе нават партызанскіх атрадаў "казацкай вольніцы". "Нягледзячы на тое, што агульнае кіраўніцтва над партызанамі была даручана камандзіру атрада 11-й кавалерыйскай дывізіі падпалкоўніку Астраградскаму, які атрад, дзе і якім чынам будзе дзейнічаць, вырашаў выпадак. Раён аперацыі, якая павінна была адбыцца быў разбіты на ўчасткі, і кожны начальнік атрада цягнуў жэрабя, каму які ўчастак выпадзе. У выніку дайшло да абсурда! Атраду штабс-ротмістра Ткачэнка, які вёў разведку раёна і лепш за ўсіх ведаў мясцовасць, выпала, гаворачы сучаснымі тэрмінамі, удзел у "ізаляцыі раёна і аб'екта набегу" [5].

На гэтым праблемы не закончыліся. Калі партызаны разабраліся ў сітуацыі, то зразумелі, што неабходна збудаваць мост праз раку Струмень. Нягледзячы на ціхую плынь шырыня дадзенай ракі дасягала 40 метраў. Пераправа на лодках вялікай колькасці людзей не толькі б заняла шмат часу, але і магла б быць заўважанай

праціўнікам. Двое сутак 11 – 12-га лістапада 1915г. не меней 10-ці чалавек на чале з прапаршчыкам Янбулатавым, пераапрануўшыся ў сялянскае адзенне, узводзілі вузкі масток праз раку. Як толькі працу скончылі, пад'ехалі дзве павозкі немцаў падпілілі гэтае збудаванне і яно паплыла па рацэ няведама куды. Аказваецца, што нямецкімі патрулямі была "выяўлена, што ў раёне Каморы рускія будуюць масток праз Струмень" і яны да пары, да часу наглядалі за гэтым працэсам [11, с. 174].

Надвячоркам 13 лістапада 1915г. прыфрантавую вёску Каморы наведала яшчэ адно партызанскае аддзяленне на гэты раз на чале з прапаршчыкам Сідарам Паўлюкаўцом. Паўлюкавец з'яўляўся ўраджэнцам недалёкай адсюль вёскі Махро, яго цікавіў лёс сваёй сям'і: жонкі і гадавалага сына. Але ніхто нічога не ведаў, бо гэта ўжо быў другі бок фронту, яму толькі паведамілі, што з яго месц немцы вывозілі моладзь на работы ў Германію, а "у яго роднай вёсцы і ўвогуле быў створаны лагер для палонных" [12]. Размаўляючы на роднай паляшуцкай мове Паўлюкавец хутка набыў давер у мясцовых жыхароў і тыя далі згоду на некалькі гадзін размясціць вялікі партызанскі атрад у сваіх хатах. Атрад з'явіўся на досвітку пад пакровам цемнаты 14 лістапада. "Каб не выклікаць падазрэння ў нямецкіх назіральнікаў з прычыны істотнай канцэнтрацыі людзей у Каморах, радавому складу забаранілі пакідаць хаты днём" [11, с. 175]. Але галоўнае, "для вылазкі патрэбна было зрабіць пераправу праз раку Струмень, і Паўлюкавец дамовіўся з мясцовымі жыхарамі аб дапамозе" [12]. Кожны гаспадар у вёсцы меў па 2 – 3 лодкі. Пад вечар 14 лістапада было выбрана 40 лодак. Гэтыя лодкі прама на беразе былі па парах узятыя на абардаж, г. зн. па дзве замацаваныя адна да другой. Па загаду Паўлюкаўца праз раку была перакінута вяроўка, якая ляжала на вадзе, але была завязана на абодвух берагах за дрэвы.

Як толькі добра сцямнела пачалася пераправа. Дваццаць мясцовых жыхароў на сваіх двух звязаных лодках выплывалі на раку, ставячы лодкі па шырыні адна да другой, а вяроўка з'яўлялася своеасаблівым тормазам не даючым ім плыць па цячэнню. Вось так за некалькі хвілін быў збудаваны зручны і даволі надзейны пантонны мост. Пераскакваючы з адной лодкі ў другую, адразу па два чалавекі, партызаны вельмі хутка пераправіліся з аднаго берага на другі са зброяй і неабходным правіянтам [3]. Што датычыцца зброі, то партызаны " паміма вінтовак і карабінаў былі ўзброеныя гранатамі (акрамя таго, казакі-кубанцы мелі кінжалы, а афіцэры – рэвальверы)"[3].

Патрэбна аддаць доўжнае германцам, яны ў цэлым разумелі сітуацыю і адзначалі, што за канфіскованную маёмасць і жыўнасць, за выкарыстанне беларускіх сялян як бясплатнай рабочай сілы, тыя будуць шукаць магчымасці ім адпомсціць: "Некаторыя з іх (сялян, Ц. М.), вельмі добра ведаюць шляхі і праходы праз балота, ноччу яны пракраліся да рускіх і прынеслі ім звесткі аб слабасці нямецкіх пазіцый, выдалі ім, што 3-ці батальён выкарыстоўвае пароль "Wulffen", а 2-гі – " Paletta", і праінфармавалі праціўніка аб распалажэнні нешматлікіх пастоў у Невелі і вакол яго "[11, с. 174].

Бяспрэчна, што ў дадзеных абставінах партызаны задзейнічалі падчас свайго паходу некалькіх мясцовых праваднікоў. Хутчэй усяго праваднік быў у кожным атрадзе, за выключэннем атрада з Арэнбургскай дывізіі, дзе функцыі праваднікa выконваў ( як мясцовы ) прапаршчык Сідар Паўлюкавец. Вядома, што ён крочыў першым, але ідучы за ім камандзір атрада капітан Сцяпан Лявонцьеў нечакана аступіўся і рухнуў у дрыгву. Калі капітана Лявонцьева стала зацягваць багнай усе разгубіліся і толькі Паўлюкавец загадаў не рабіць ніякіх рухаў, а сам працягнуў яму доўгую палку, і з дапамогай таварышаў выцягнуў Лявонцьева з дрыгвы [12]. Такім чынам не без цяжкасцяў, па калена ў вадзе балотнае ўрочышча Надзейжа партызанамі была пераадолена.

Далей галоўным крочыў партызанскі атрад з 1-й Данской казачай дывізіі. Рухаючыся "з мясцовымі жыхарамі і валодаючымі нямецкай мовай рускімі егерская каманда павінна была прайсці праз нямецкія лініі паміж апорнымі пунктамі "Аугсбург" і "Берлін" (проста збудаваныя апорныя пункты каўзераўцы часта называлі па назвах гарадоў у Германіі). Каля 23:00 гадзін ночы рускія маршавай калонай наблізіліся да апорнага пункта "Берлін". Паміж гэтым умацаваннем і пазіцыяй "Аугсбург" была адлегласць 800 м, трыснёг і кусты выключалі магчымасць поўнага агляду. Адзін з вартавых, што стаяў у дазоры ўбачыў, як перад ім з зарасляў выныраваюць фігуры, ён кінуўся бегчы да апорнага пункту, але на яго накінуліся і захапілі ў палон. Другі стаяўшы ў дазоры быў зняты выстраламі"[11, с. 175, 176]. Так без асаблівых праблем партызаны прайшлі паміж абодвумі апорнымі пунктамі і выйшлі на дарогу Невель-Жыдча. Тут яны перарэзалі ўсе тэлефонныя лініі ўздоўж дарогі і тым самым перарвалі сувязь штаба палка з сваім 2-м батальёнам, таму ён да самага ранку наступнага дня нічога не ведаў аб нападзе [11, с. 176].

Увогуле для партызан у гэтую ноч з 14 на 15 лістапада абставіны складваліся найлепшым чынам. "Вечарам 13 лістапада ў Невель для агляду пазіцый прыбылі камандзір дывізіі генерал-маёр Фабарыус, афіцэр генеральнага штабу маёр Нейгоф і падпалкоўнік медслужбы доктар Вібер… камандзір дывізіі і суправаджаючыя яго асобы, зрабіўшы агляд у другой палове дня пазіцыі палка, мелі намер адразу вечарам вярнуцца ў штаб-кватэру дывізіі. Аднак радыятар іх аўтамабіля замёрз, і па-гэтаму генерал вырашыў заначаваць у Невелі. Акрамя таго, у вёсцы чакалі прыбыцця 1-га батальёну, і пасты, якія ўбачылі прыбліжэнне да іх рускіх, меркавалі, што гэта свае" [11, с. 175].

Тым часам партызаны падыйшлі да Клацільдавага канала, дзе па папярэджаннях праваднікоў на масту праз канал павінен стаяць двайны пост, а далей шлях ужо быў свабодны да самага Невеля. Германская крыніца аб гэтым паведамляе так: "Рускія, што размаўлялі па-нямецку, знаходзячыся ў галаве калоны, пракрычалі вартавым на масту праз Клацільдаў канал: "Мы немцы! Не страляйце!" Калі нашы людзі апусцілі вінтоўкі, іх закалолі" [11, с. 176]. Для таго, каб безперашкодна забяспечыць пасля аперацыі свой адыход, партызаны пакінулі на масту сваю ахову і затым рушылі да Невеля. Што адбывалася далей? Нават нямецкія крыніцы апісваюць для

сябе даволі жудасную карціну: "… рускія абсалютна свабодна бяруць у кальцо Невель з заходняга, паўночнага і ўсходняга бакоў, а затым невялікімі групамі акружаюць зямлянкі, у вокны якіх бесперапынна кідаюць ручныя гранаты альбо страляюць з вінтовак. Не было літасці нават да пазначаных чырвонымі крыжамі домікаў для хворых; санітараў, хворых і параненых забівалі без разбору. У тых людзей, хто знаходзіўся ў зямлянках, не было проста часу схапіць зброю і выскачыць на двор для сваёй абароны. У большасці выпадкаў яны разарваныя гранатамі яшчэ ў сваіх памяшканнях. Адна за другой зямлянкі загараюцца ад выбухаў, і гэта яшчэ больш узмацняе мітусню, замяшанне" [11, с. 176].

Але гэта вайна, тым больш у тылу ворага і ў такіх выпадках шукаць гуманнасці не прыходзіцца. У партызанскіх набегах, як правіла, у палон не бралі, улічваючы той факт, што палонныя абцяжарвалі і абмяжоўвалі баявую дзейнасць у той час, калі кожная хвіліна вельмі дарагая і магла каштаваць жыцця цэламу атраду.Па расійскіх крыніцах вынікае, што партызаны лесам падыйшлі і акружылі вёску разам з сядзібай Невель. Затым кожны атрад выйшаў да свайго загадзя запланаванага аб'екта. Так як на тым ці іншым аб'екце мелася некалькі пабудоў, то атрады ў сваю чаргу былі падзеленыя на партыі і кожная партыя на чале з камандзірам выконвала пастаўленую задачу. Вядома, што штурм германскага гарнізона пачаўся па ўмоўнаму сігналу "ўсё гатова". Дадзены сігнал азначаў, што кожны атрад павінен падаць знак аб сваёй гатоўнасці падпалкоўніку Астраградскаму аднаразавым воўчым выццём. Атрымаўшы ад усіх сігнал, ад'ютант Астраградскага адказаў усім атрадам тым жа выццём толькі 3 разы запар. Менавіта гэты знак з'яўляўся паведамленнем для ўсіх адначасова ісці ў атаку [12]. Атрад з 1-й Данской казачай дывізіі атакаваў германскі гарнізон з паўночна-заходняй ускраіны Невеля. Падзяліўшыся на партыі, якія прадстаўлялі 9-ты полк на чале з пад'есавулам Пярфілавым, 10-ты на чале з харунжым Лазаравым, 13-ты камандзір прапаршчык Сафронаў і 15-ты, што ўзначальваў прапаршчык Зорын, партызаны некалькі хвілін, без стральбы ўрываліся ў зямлянкі і калолі спячых немцаў штыкамі. Тыя зямлянкі, дзе вораг апомніўся і пачаў аказваць супраціўленне казакі закідвалі гранатамі.

Такім чынам, згодна з данесеннем дадзенага атрада: "… Усяго атрадам было знішчана каля 200 салдат, спалена 27 жылых памяшканняў, 10 вялікіх складаў з фуражом, узарвана паходная кухня, 5 павозак з інтэнданцкай маёмасцю" [5]. Пры гэтым толькі двое партызан былі паранены і адзін кантужаны.

Атрад з 7-й кавалерыйскай дывізіі, які ўзначальвалі штабс-ротмістр Чатыркін, карнеты Львоў, Вестлі і прапаршчык Барысаў атакаваў цэнтральную частку вёскі. Пры падыходзе да свайго аб'екта кавалерысты наткнуліся на вартавых, але тыя кінуўшы зброю, збеглі. Каб нанесці нечаканы, адначасовы ўдар партызаны атрада падзяліліся на групы, якімі акружылі пабудовы і зямлянкі. За кароткі час у ходзе атакі гэтым атрадам (па іх звестках) было "знішчана 70 салдат праціўніка, у тым ліку вялікая група штабных афіцэраў. Траіх немцаў узялі ў палон, узарвалі 6 зямлянак з германцамі, якія там знаходзіліся і 6 патронных двуколак. Параненымі атрад страціў аднаго афіцэра (Барысава) і пяцярых ніжніх чыноў" [13].

Непасрэдная падтрымка і дапамога атраду з 7-й кавалерыйскай дывізіі аказвалася ў цэнтры Невеля Зводна-Гвардзейскім атрадам. Згодна жэрабя гэтаму атраду выпала атакаваць участак з царквой, вінную лаўку, пастаялы двор, школу, дом дзяка і 12 зямлянак. Пераадолеўшы германскія абаронча-дротавыя ўмацаванні і зняўшы з дазору пяць вартавых гвардзейцы сышліся з праціўнікам у бязлітаснай рукапашнай схватцы. У гэтым упартым баі 1-й і 2-й партыямі атрада, якімі з'яўляліся партызаны з лейб-гвардыі Гродзенскага гусарскага і лейб-гвардыі Уланскага палкоў камандаваў карнет Вайцахоўскі, 4-й партыяй, у якой знаходзіліся байцы 1-га і 2-га Заамурскіх конных палкоў, кіраваў штабс-ротмістр Мікольскі. Агульнае кіраўніцтва дадзеным атрадам ажыццяўляў ротмістр 18-й Валынскай пагранічнай брыгады Фішар. З асабістага данясення атрада вынікае наступнае: "Штабс-ротмістр Мікольскі з унтэр-афіцэрам Зайнетдзінавым двайнымі зарадамі ўзрыўчаткі ўзарвалі дзве германскія гарматы. Тым часам партыі Вайцахоўскага (ужо параненага асколкам гранаты ў руку) знішчылі 5 патронных двуколак. Усяго атрадам спалена: 15 зямлянак, 1 санітарная павозка, 2 хлявы з конямі, знішчана 200 салдат праціўніка, у тым ліку ўзятыя ў палон 60 салдат з унтэр-афіцэрам – усе яны былі забітыя (акрамя 4-х) пры адыходзе да лесу, так як, пачуўшы выстралы з нямецкага боку, аказалі супраціўленне" [5]. Страты атрада склалі 5 лёгкапараненых партызан.

З паўднёвага боку замыкаў круг вакол Невеля атрад з Арэнбургскай казачай дывізіі на чале з беларусам капітанам Лявонцьевым. Казакі Лявонцьева адказвалі за ўчастак вёскі ўздоўж дарогі на Прыкладнікі. Вядома, што напачатку боя атрад паспяхова выконваў пастаўленую камандзірам задачу. Звесткі з партызанскага данясення сведчаць аб гэтым так: "Уварваўшыся ў вёску, казакі пачалі знішчаць сонных немцаў у хатах і кідаць гранаты ў зямлянкі. Як толькі пасля пераможнай, жорсткай схваткі атрад сабраўся па ўмоўнаму свістку камандзіра, ударыў вінтовачны залп з шэрагаў падыйшоўшага падмацавання праціўніка. Быў смяртэльна паранены ў жывот капітан Лявонцьеў. Партызаны, адступаючы, вынеслі яго цела на руках" [5]. Пасля чаго камандаванне атрадам узяў на сябе прапаршчык Паўлюкавец, які дастойна і ўмела працягваў кіраваць атрадам, змогшы вывесці яго з пад агня ворага. У ходзе боя партызаны дадзенага атрада знішчылі 10 лазарэтных павозак, 2 двуколкі з тэлеграфнай маёмасцю, склады з фуражом. Адначасова разам з Лявонцьевым загінулі яшчэ чацвёра партызан, адзінаццаць былі паранены. Разумеючы, што Сцяпан Лявонцьеў фактычна з'яўляўся галоўным арганізатарам Невельскай аперацыі, ён быў пасмяротна прадстаўлены да чына падпалкоўніка і ордэна Святога Георгія III ступені. У выдадзеным загадзе ад 9 ліпеня 1916 г. наконт подзвіга Лявонцьева пазначана: "Сваёй самаахвярнай храбрасцю і самавалоданнем, у самых небяспечных абставінах, садзейнічаў бліскучаму поспеху набегу… падчас кіраўніцтва партызанамі Падпалкоўнік Лявонцьеў у разгары набегу быў смяротна паранены варожай куляй і смерцю сваёй увасобіў учынены ім геройскі подзвіг" [13].

Падчас набегу найбольшага поспеху змог дамагчыся атрад з 11-й кавалерыйскай дывізіі. Гэтым атрадам, як і дарэчы агульным кіраўніцтвам усіх атрадаў, камандаваў падпалкоўнік Астраградскі. Па жэрабю атрад павінен быў атакаваць усю невельскую сядзібу з вялікім гаспадарчым дваром і размешчанымі на ім гасподскім домам, а таксама living рознымі жылымі і нежылымі пабудовамі. Выйшаўшы да камяністых вышынь у паўкіламетры ўсходней вёскі, атрад падзяліўся на партыі. Асноўная частка сілаў рушыла да аб'екту нападу, але адна партыя засталася, на ўсялякі выпадак, для прыкрыцця. Без асаблівых турбот зняўшы вартавых, што стаялі ў дазоры, партызаны ўшчыльную падабраліся да сядзібы. Затым партыі з 12-га і 42-га Данскіх казачых палкоў імкліва кінуліся да сядзібы заняўшы ўсходнюю ўскраіну агароджанага сада з мэтай забяспечыць безперашкоднае пранікненне ў гасподскі двор іншых партый збоку камяністых вышынь. У выніку партыяй гусар былі акружаны хлявы жывёльнага двара, казакі з 37-га Данскога палка ўварваліся ў германскія канюшні, а драгуны атакавалі пабудовы для прыслугі. Аднак галоўнай мэтай для партызан было авалоданне цэнтральным будынкам – гасподскім домам, дзе знаходзіўся штаб 271-га пяхотнага рэзервовага палка нямецкай арміі. У дадзеным доме знаходзіліся афіцэры штаба, сталовая, канцылярыя, тэлеграфны і збройны пакоі. Усе падрабязнасці размяшчэння штаба партызанам былі добра вядомы ад мясцовых жыхароў, якіх пад прымусам застаўлялі пад наглядам немцаў тут працаваць: прыбіральшчыцамі, пасудамойкамі, пераносіць мэблю, займацца дастаўкай тых ці іншых прадуктаў харчаванння і г.д. Па гэтаму нядзіўна, што адным з першых быў захоплены збройны пакой. Аб чым нямецкая крыніца распавядае так: “Пярэдні пакой у паўночнай частцы будынка, дзе знаходзіліся вінтоўкі каравула, быў заняты ворагам. Такім чынам, уся зброя папала ў рукі праціўніка, альбо была пашкоджана ручнымі гранатамі. Не было бачна, каб хто-небудзь з нашых людзей, што знаходзіліся ў замку меў пры сабе вінтоўку”[11, с. 177]. Партыя ўланаў з 11-га Чугуеўскага палка прыблізіўшыся да шкляной галярэі дома за вокнамі якой убачыла працуючых у апаратаў тэлеграфістаў. Калі ўланы ўварваліся ў памяшканне, то захопленыя знянацку тэлеграфісты тут жа здаліся ў палон. Не затрымліваючыся партызаны авалодалі прыёмнай, канцылярыяй і афіцэрскай сталовай, адкуль германскія афіцэры пачалі адстрэльвацца з рэвальвераў. Так як у іх кідаліся гранаты, то некаторыя з афіцэраў рабілі спробы выскачыць з вакна, альбо бегчы ў дзверы, але ўсюды натыкаліся на партызан і знішчаліся[3]. У сваю чаргу як адбываліся падзеі ў гасподскім доме ёсць успаміны занатаваныя непасрэдным удзельнікам іх германскім афіцэрам: “Рускія ўчынілі страшэнную расправу над афіцэрамі, якія знаходзіліся ў гасподскім доме. Апанаваныя прагай крыві, яны штыкамі расправіляліся з усімі, хто сустракаўся на іх шляху. Камандзір 69-га рэзервовага палка падпалкоўнік фон Розенберг-Ліпінскі атрымаў з блізкай адлегласці выстрал у жывот; маёра Нейгофа па-звярынаму збівалі прыкладамі і калолі штыкамі, пакуль ён не ўпаў мёртвым. Падпалкоўнік фон Хейкінг схапіў за ножку стул і абараняўся з мужнасцю асуджанага. Тады яму прама ў грудзі ўсадзілі штык. Яго ад'ютанту Меркелю, які імкнуўся парыраваць смяротны ўдар, адсеклі правую руку. Ён узяў сваю зброю – ножку стула ў левую і працягваў змагацца. У рэшце рэшт 2 удары ў правы бок галавы пазбавілі яго здольнасці вясці барацьбу, ён зваліўся, а рускія пакінулі яго ляжачым, думаючы, што ён загінуў. Падпалкоўнік медслужбы доктар Вібер быў цяжка паранены, пазней ён памёр у лазарэце. Генерал-маёра Фабарыуса і дывізійнага святара Форверка не забілі, ударамі прыкладаў іх выгналі з гасподскага дома, каб забраць з сабой у палон” [11, с. 189].

Вось так атрымалася, што па маючых ад мясцовых жыхароў звестках, партызаны разлічвалі захапіць варожы штаб палка, а выйшла, што яны авалодалі фактычна штабам дывізіі, які напярэдадні прыбыў у Невель. Што датычыцца генерал-маёра Карла Фрыдрыха Зігфрыда Фабарыуса, то вядома, што ён фактычна сам накінуўшы на плечы генеральскую шынель з паднятымі рукамі выйшаў да партызан. Магчыма, гэтым учынкам хацеў адцягнуць на сябе ўвагу і даць спасціся хоць якой-небудзь частцы афіцэраў свайго штаба. Але лаўры захопу і паланення Фабарыуса дасталіся прапаршчыку Янбулатаву ды драгунам з партыі 11-га Рыжскага палка Кузняцову і Хрыпунову. Дарэчы, гэта быў увогуле адзіны страявы германскі генерал, які быў паланёны расійскай арміяй за ўвесь час Першай сусветнай вайны. За некалькі дзён, што быў у палоне вёў сябе даволі годна, але падчас перавозкі генерала ў штаб 8-й арміі зрабіў выгляд, што хоча пагаліцца і брытвай паласнуў сябе па горлу, затым у падбегшага да яго дзеншчыка выцягнуў з партупеі рэвальвер і дастраліўся.

Усяго ў фальварку Невель атрадам з 11-й кавалерыйскай дывізіі штыкамі і гранатамі была знішчана да 10 афіцэраў, 150 салдат праціўніка, а таксама ў канюшнях да 50 коняў. У гасподскім доме была захоплена зброя і ўзарваныя тэлефонная і тэлеграфная станцыі. Вельмі важнае значэнне мелі прыхопленыя ў канцылярыі штабныя дакументы і карты, якія істотна прасвятлілі сітуацыю аб знаходжанні асабістага складу, намеры і месцы перадыслакацыі жывой сілы, а таксама распалажэння складаў узбраення, харчавання, фуражных запасаў групоўкі германскіх войск у пінскім рэгіёне. Аднак працягласць, складанасць боя ў гасподскім доме і сядзібным двары затрымалі атрад Астраградскага болей разлічанага часу. Як адбываўся адыход гэтага атрада, чытаем з запісу германскага афіцэра: “Адзін з рускіх афіцэраў (Астраградскі, Ц.М.) пастроіў сваіх людзей на пляцоўцы перад сядзібай, а затым уся калона, з намі палоннымі ў сярэдзіне, накіравалася да варот сада. Адразу пасля таго, як былі пройдзены вароты і непадалёку ад дома і хлявоў за межамі сядзібнага двара паказаліся немцы, рускі, які ведаў нямецкую мову выйшаўшы наперад пракрычаў: “Не страляць, немцы!” Нас палонных выштурхалі наперад, і прыкрываючыся намі рускія адкрылі агонь. Генерала падганялі прыкладамі, паколькі ён крочыў недастаткова хутка. Рускія адмовіліся ад свайго намеру вярнуцца ў вёску, калі там у праблесках полымя можна было ўбачыць фігуры нямецкіх салдат, яны працягвалі свой рух у паўночным накірунку да лесу” [11, с. 178].

Як бачым, падчас адыходу з сядзібнага двара атрад з 11-й кавалерыйскай дывізіі наткнуўся на групу германскіх салдат, якія імкнуліся прыйсці на выручку свайму штабу. У ходзе ўзнікшай перастрэлкі палонныя

зрабілі спробу збегчы і былі перастраляныя партызанамі. За выключэннем двух-трох афіцэраў, што ўпалі на зямлю і прытварыліся забітымі, а таксама генерала Фабарыуса, якога пільна ахоўвалі з мэтай дастаўкі ў сваё распалажэнне як каштоўнага “языка”. З дапамогай пакінутай групы прыкрыцця з боем атраду ўдалося прарвацца да ляснога масіва, яго страты склалі: 1 – забіты, 8 – параненых і 1 – прапаў без звестак [4].

Такім чынам, сабраўшыся ва ўмоўным месцы і вынесшы ўсіх сваіх забітых і параненых усе атрады арганізавана распачалі агульны адыход. Цяпер ужо атрадам ахоўнай грпы з 10-й, 12-й кавалерыйскіх і 1-й Церскай дывізій, што знаходзіліся ў прыкрыцці патрэбна была вытрымаць суровы бой з германцамі, каб даць магчымасць адарвацца ад нямецкага праследу асноўным сваім сілам. Адбіўшы ўсе атакі ворага, апошняй вайсковай партызанскай адзінкай, якая перайшла і спаліла за сабой мост на Клацільдавым канале быў невялікі атрад з 12-га драгунскага палка на чале з карнетам Канстанцінам Івановым. Затым увесь партызанскі атрад на чале з Андрэям Астраградскім беспераШкодна падыйшоў да ракі Струмень, дзе іх чакала астаўленая група партызан з мясцовымі жыхарамі; зноў жа надзейна партызаны пераадолелі пантонны лодачны мост Паўлюкаўца толькі ў адваротны бок і аказаліся ў Каморах. Мясцовая лодачнікі перагнаўшы лодкі да свайго берага ракі, тым самым спынілі існаванне гэтага маста.

Расійскае камандаванне нічога не зрабіла дзеля таго, каб выратаваць жыхароў украінскай вёскі Каморы і жыўшых тут шматлікіх жыхароў навакольных беларускіх вёсак, у тым ліку Невеля, якія так шмат дапамаглі ў паспяховым ажыццяўленні партызанскага рэйду. Не была прадпрынята ніякіх спроб, каб эвакуіраваць насельніцтва ці абараніць яго з дапамогай сваёй артылерыі. У выніку сухая канстатацыя адбыўшагася факту: “Вёска Каморы ў хуткім часе была змецена з твару зямлі агнём германскай артылерыі, але партызан ужо перакінулі на іншы фронт” [3]. Як бачым, расійскае камандаванне гэтая праблема зусім не хвалявала. Галоўнае, што не пацярпелі партызаны.

Такім чынам, напачатку германскай акупацыі партызанскі рух на Піншчыне ў сваёй большасці існаваў у выглядзе вылазак у тыл ворага спецыяльна створаных для гэтага армейскіх атрадаў і фактычна не меў дастатковай, надзейнай апоры сярод мясцовага насельніцтва. Дадзеную акалічнасць можна растлумачыць тым, што належнай, узважлівай работы ў гэтым накірунку з мясцовым насельніцтвам не праводзілася. Мясцовыя жыхары з набліжэннем кайзераўскіх войск масава і часта прымусова выганяліся з роднага краю, ператвараючыся ў бежанцаў, якім была самім патрэбна дапамога. Не спрыяла гэтаму і тактыка “спаленай зямлі”, якую метадычна выкарыстоўваў на нашых землях тагдашні галоўнакамандуючы расійскімі войскамі вялікі князь Мікалай Мікалаевіч. Поспех мелі толькі адзінкавыя аперацыі, у тым ліку і невельская, дзе прымалі непасрэдны ўдзел прадстаўнікі з беларускіх земляў, што служылі ў расійскіх войсках, якія ўмелі і маглі наладзіць кантакт з жыхарамі Палесся.


1. Памяць : гіст.-докум. хроніка Іванаўскага р-на. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 592 с.
2. Иванов, А. Как партизаны немецкого генерала в плен взяли / А. Иванов // Русская народная линия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ruskline.ru/history/2015/12/08/ kak_partizany_nemeckogo_generala_v_plen_vzyali. – Дата доступа: 18.03.2023.
3. Олейников, А. Самый ценный трофей русских партизан 1915 года / А. Олейников // Битва Гвардий [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://btgv.ru/history/faces-of-war/the-most-valuable-trophy-of-the-russian-partisans-in-1915/. – Дата доступа: 18.03.2023.
4. Заварошкин, В. Партизаны Первой мировой / В. Заварошкин // Белорусская военная газета. – 2006. – 28 октября.
5. Гребенников, О. Как была проведена одна из наиболее громких диверсионных операций Первой мировой «Налет на Невель»? / О. Гребенников // Беларусь Сегодня [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/im-vypal-zhrebiy-nastupat.html. – Дата доступа: 18.03.2023.
6. Памяць: Гіст. –дакум. Хроніка Пінска. – Мн.: БЕЛТА, 1998. – 557 с.
7. Цуба, М.В. Партызанскі рух на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны / М.В.Цуба // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. - №8. – 9-12 с.
8. Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 Обработано по официальным данным Германского Генерального Штаба в 1917 году капитаном Пэльман. Петроград. 1921. – 123 с.
9. Брусилов, А.А. Мои воспоминания / А.А. Брусилов. – М., 1946. – 264 с.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 9184. – Л.20.
11. Bierwagen, Max. Zwischen Somme und Pripjet . Geschichte des Reserve-Infanterie-Regiments Nr 271, im Weltkriege 1914 bis 1918. Erster Teil: Von der Gründung des Regiments bis zum März 1917 / Max Bierwagen. – Breslau, 1927. – 205c.
12. Сухоцкая, Т. Первая мировая. Партизаны / Т. Сухоцкая, А. Матвиенко // Телеканал ОНТ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=MkHc9n_JF1A. – Дата доступа: 24.04.2023.
13. Бондаренко, В.В. Партизан Великой войны: Степан Леонтьев / В.В. Бондаренко // ВикиЧтение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://info.wikireading.ru/239562?ysclid=lfo4ix6tfu576343760. – Дата доступа: 23.04.2023.